# Жывое слова паэта: Браніслаў Ермашкевіч у гасцях у гімназістаў

**На старце новага навучальнага года паэт Браніслаў Ермашкевіч выступіў у Дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага г. Гродна».**

У рамках патрыятычна-асветніцкага праекта «Жывое слова. Урокі з пісьменнікамі» ў 8 «В» класе гімназіі адбылася цёплая і шчырая сустрэча з вядомым беларускім паэтам, ганаровым членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Браніславам Іосіфавічам Ермашкевічам.



Нягледзячы на свой паважаны ўзрост (у гэтым годзе патрыярху беларускай паэзіі Прынёмання споўнілася 89 гадоў), Браніслаў Іосіфавіч застаецца актыўным удзельнікам літаратурнага жыцця. Ён ахвотна сустракаецца з моладдзю, упэўнены, што пра сур'ёзныя рэчы з дзецьмі трэба гаварыць з ранняга ўзросту. Паэт шмат гадоў аддаў ваеннай службе (1956-1982), а пасля выхаду ў адстаўку працаваў настаўнікам. Яго багаты жыццёвы вопыт і шчырая любоў да Радзімы знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх паэтычных зборніках: «Надзённае» (2001), «Навучанне зямлёй» (2004), «Зямлі маёй нераўнавага» (2007), «Абярэг» (2012), а таксама ў ваенна-патрыятычнай трылогіі з кніг «Водсвет далёкіх дзён», «Памяць патрэбна жывым» і «Я з таго пакалення».

Падчас сустрэчы Бранiслаў Iосiфавiч распавёў васьмікласнікам пра свой жыццёвы і творчы шлях, патлумачыў, як нараджаюцца яго вершы, і што дае яму сілы і натхненне. Госць чытаў свае творы на роднай беларускай мове, закранаючы самыя вострыя тэмы — захаванне гістарычнай памяці, любоў да Айчыны, адзінства ў грамадстве і ролю сучаснага пісьменніка ў гэтых надзвычай важных справах. Вучні з вялікай увагай слухалі паэта, які сваім прыкладам паказаў, што значыць быць сапраўдным грамадзянінам і патрыётам.

Асаблівым момантам сустрэчы стала прэзентацыя новай кнігі аўтара — «Я з таго пакалення», якая сёлета папоўніла кніжную скарбніцу Прынёманскага краю. Гэтае доўгачаканае выданне прысвечана 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і ўваходзіць у адмысловую тэматычную трылогію гродзенскага літаратара. Як адзначае сам аўтар у анатацыі: «Кніга “Я з таго пакалення” апавядае пра нашу прыналежнасць да вялікага праз адчуванне штодзённага – абароны Айчыны і захавання памяці пра наша гераічнае мінулае».



На завяршэнне сустрэчы Браніслаў Іосіфавіч зрабіў каштоўны падарунак — падарыў сваю новую кнігу «Я з таго пакалення» бібліятэцы гімназіі. Гэты жэст сімвалічны: так паэт перадае эстафету памяці юнаму пакаленню, заклікаючы юнакоў і дзяўчат быць годнымі мужнасці сваіх дзядоў і прадзедаў.

Сустрэча з сапраўдным майстрам слова, яго шчырыя вершы і жыццёвыя гісторыі надоўга застануцца ў памяці васьмікласнікаў. Дыялог пакаленняў, які адбыўся ў гэты дзень, стаў яскравым прыкладам таго, як літаратура аб’ядноўвае людзей і ўмацоўвае повязь часоў.

**Юлія ЧАМЯРЫС**
**педагог, пісьменніца, ініцыятар**
**патрыятычна-асветніцкага праекта**
**«Жывое слова. Урокі з пісьменнікамі»**

**На фота:** на старце новага навучальнага года ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага г. Гродна» выступіў ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Браніслаў Іосіфавіч Ермашкевіч. 2 верасня 2026 года.










У дапамогу настаўніку
Планета перыёдыкі
Кніжны кругагляд
Экспрэс-выстава
Маладзёжны веснік


Экспрэс-выстава
Маладзёжны веснік
Символы моей страны
Здравствуй страна знаний!
Браніслаў Ермашкевіч
Я з таго пакалення


Зямлі маёй неравунавага
Браніслаў Ермашкевіч




Гимназия №6
имени Ф.Э.Дзержинского
г.Гродно

www.pisateli.by